База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# І ЗАЛУНАЎ ЧЫРВОНЫ ФЛАГ...

**У франтавой чырвонаармейскай газеце «Знамя Советов» 27 лістапада 1943 года была змешчана карэспандэнцыя «Першы». У ёй расказвалася аб тым, як батальён капітана Шыка першым фарсіраваў Сож, а яфрэйтар гэтага падраздзялення Ф. Васільеў на будынку электрастанцыі ў Гомелі ўстанавіў Чырвоны флаг.**

**Аб гэтым жа пісала ў той дзень і газета «Красная звезда».**

**Б. Н. Шык цяпер жыве і працуе у Маскве. У гэтыя дні ён — госць нашага горада. Мы сустрэліся з ім і папрасілі расказаць аб дзеяннях батальёна ў тыя дні. Вось што Барыс Навумавіч паведаміў.**

У лістападзе 1943 года батальён, якім я камандаваў, уваходзіў у састаў 39-га стралковага палка 4-й Бежыцкай стралковай дывізіі. Ён займаў рубеж абароны ў раёне вёскі Якубоўка на беразе ракі Сож. А на процілеглым беразе па парку праходзіла моцна ўмацаваная абарончая лінія варожых войск.

Камандуючым арміяй батальёну было загадана: 25 лістапада ноччу фарсіраваць Сож і прыняць удзел у вызваленні Гомеля. Гэта была вельмі адказная і складаная задача. Рака ў гэтым месцы вельмі глыбокая, з нямецкага боку высокі вертыкальны бераг. Поспеху можна было дабіцца толькі за кошт раптоўнасці ўдару. Вось чаму падрыхтавалі штурмавыя групы, дакладна вызначылі парадак фарсіравання ракі. Наступіла рашаючая ноч. Па сгналу на ваду былі спушчаны 15 лодак, раней старанна замаскіраваных на беразе. Першым пераправіўся цераз Сож камандзір кулямётнай роты старшы лейтэнант Марчанка з групай сувязістаў і сапёраў. Сапёры хутка зрабілі праходы ў мінных палях і дротавых агароджах. Фашысты, ашаломленыя дзёрзкасцю дзеянняў савецкіх воінаў, спахапіліся, але ўжо было позна. Батальён уварваўся на вуліцы горада.

У гэты час яфрэйтар Васільеў паімчаў да высокага будынка гарадской электрастанцыі і ўстанавіў над ім Чырвоны флаг — сімвал вызвалення. А назаўтра гэты эпізод быў апісан у цэнтральных і франтавых газетах. Прыемна было чытаць тыя радкі і ўсведамляць, што ратнымі справамі мы унеслі свой уклад ў вызваленне Гомеля,.

Горад тады — груды руін. Гітлераўцы знішчылі ўсё, што можна было знішчыць.

З таго часу мінула 40 гадоў. З трапяткім хваляваннем праходжу я цяпер па вуліцах і скверах горада. Гомель занава адбудаваны. Гэта — горад-прыгажун. Колькі ж упартай працы ўкладзена яго жыхарамі, усімі савецкімі людзьмі ў гэтае адраджэнне!

Карыстаючыся прадастаўленай магчымасцю, ад ўсёй душы хачу сказаць: новых вялікіх поепехаў ва ўсіх вашых справах, дарагія гамяльчане!